Сучасная беларуская літаратурная мова

Для студэнтаў устаноў
вышэйшай адукацыі

Сучасная беларуская літаратурная мова

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь
у якасці вучэбнага дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі
па філалагічных спецыяльнасцях

Пад рэдакцыяй Д.В. Дзятко

Мінск
«Вышэйшая школа»
2017

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.2Беи-923
С91

А ў т а р ы: Дзятко Д.В., Лобань Н.П., Мароз С.С., Міхайлаў П.А., Нямковіч Н.М., Радзіваноўская Н.А., Ржавуцкая М.С., Самахавец В.І., Старасценка Т.Я., Урбан В.В., Чайка Н.У., Шахоўская С.У.

Р э ц э н з е н т ы: кафедра беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава” (загадчык кафедры кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Г.А. Арцямёнак*); загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта кандыдат філалагічных навук, дацэнт *З.І. Бадзевіч*

Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Узнаўленне ўсёй кнігі ці любой яе часткі не можа быць ажыццёўлена без дазволу выдавецтва.

ISBN 978-985-06-2024-8

© Афармленне. УП «Выдавецтва “Вышэйшая школа”», 2017

1.5. Нормы беларускай літаратурнай мовы

Нормы – прынятыя ў грамадска-моўнай практыцы адзіныя і абавязковыя для ўсіх носьбітаў мовы правілы вымаўлення, напісання, словаўжывання, выкарыстання традыцыйна сфарміраваных граматычных, стылістычных і іншых моўных сродкаў.

Норма – адна з істотных уласцівасцей літаратурнай мовы, што забяспечвае яе паўнацэннае функцыянаванне. Норма абавязкова захоўвае маўленчыя традыцыі і цалкам задавальняе паўсядзённыя патрэбы грамадства.

Паняцце нормы літаратурнай мовы распаўсюджваецца на ўсе яе ўзроўні. У адпаведнасці з гэтым вылучаюць:

- ***арфаэпічныя нормы*** – дакладнае вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў у вусным маўленні; напрыклад, нарматыўным з'яўляецца:
  - вымаўленне фрыкатыўнага гука [ɣ] у спрадвечна беларускіх словах: [ɣалава́] (*галава*), [ɣнуц'] (*гнуць*);
  - вымаўленне выбухнога [г] у некаторых запазычаных словах: [шва́г'ер], [гвалт], [га́нак], [гу́з'ік];
  - цвёрдае вымаўленне шыпячых і [р]: [шапта́ц'], [часно́к], [жані́х], [ро́зац'];
  - аглушэнне звонкіх зычных перад глухімі і на канцы слова: [лы́шка], [бл'і́ска], [аɣаро́т], [дуп] і інш.;
- ***акцэнталагічныя нормы*** – правільная пастаноўка націску: *спі́на*, а не *спіна́*, *мы́сленне*, а не *мысле́нне*, *цяжа́р*, а не *ця́жар*, *вы́падак*, а не *выпа́дак* і г.д.;
- ***арфаграфічныя нормы*** – аднастайная перадача вуснага маўлення на пісьме:
  - напісанне прыставак *з-*, *уз-*, *раз-*, *без-* (*бяз-*), *цераз-* перад звонкімі зычнымі з літарай *з*, а перад глухімі – з літарай *с*: *зрабіць*, *бездакорны*, *ускласці*, *бясшумны*;
  - напісанне прыставак *ад-*, *над-*, *пад-*, *перад-*, *аб-* нязменна перад звонкімі і перад глухімі зычнымі: *адрэзаць*, *адкапаць*, *перадсвяточны*, *перадвыбарчы*, *абгаварыць*, *абхадзіць*;
  - напісанне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі і на канцы слова: *градка*, *адказ*, *моладзь*, *мядзведзь* і інш.;
- ***марфалагічныя нормы*** – правілы словазмянення:
  - ужыванне лічэбнікаў *два* (*дзве*), *абодва* (*абедзве*), *тры*, *чатыры* ў творным склоне адзіночнага ліку з канчаткам *-ма*: *двума*, *дзвюма*, *трыма*, *чатырма*, *абодвума*, *абедзвюма*;
  - напісанне суфікса *-іва-* (*-ыва-*) у дзеясловах тады, калі форма 1-й асобы адз. л. канчаецца на *-ваю* і перад *-ва* ёсць спалучэнне зычных

з апошнімі *л*, *н*, *р*: *падкрэсліваю – падкрэсліваць*, *запэўніваю – запэўніваць*, *адыгрываю – адыгрываць*; калі ж перад *-ваю* няма такога спалучэння зычных, то пішацца суфікс *-ва-*: *выбельваю – выбельваць*, *выменьваю – выменьваць* і інш.;

- ***сінтаксічныя нормы*** – правілы пабудовы граматычных канструкцый:
  - пры дзеясловах *смяяцца*, *жартаваць* і іншых ужываецца дапаўненне з прыназоўнікам *з*: *смяяцца з яго*, *жартаваць з дзяцей*;
  - пры дзеясловах *дзякаваць*, *дараваць*, *прабачыць* дапаўненне ставіцца ў давальным склоне: *даруйце мне*, *прабачце мне* і інш.;
- ***лексічныя нормы*** – правільнае ўжыванне слова: *адчыніць акно*, але: *адкрыць* (*пачаць*) *сход*; у літаратурнай мове немэтазгодна ўжываць вузкадыялектную (*каплýн* ‘цура’, *жудзéль* ‘парасё’) або прастамоўную (*трапло́* ‘балбатун’, *швэндацца* ‘хадзіць’ і інш.) лексіку.

Сведчаннем грамадскага прызнання той ці іншай нормы літаратурнай мовы з’яўляецца рэгулярнасць і масавасць ужывання канкрэтнай з’явы ў працэсе камунікацыі. Найбольш паказальнай формай такога прызнання выступае ***кадыфікацыя*** – апісанне і замацаванне нормаў літаратурнай мовы ў слоўніках, граматыках, агульных і галіновых энцыклапедыях, вучэбных дапаможніках і інш.

Нарматыўнасць літаратурнай мовы з’яўляецца рэгулятарам яе сінхранічнага функцыянавання і дыяхранічнага развіцця. Яна абумоўлена *знешнімі* (*сацыяльнымі*) і *ўнутранымі* (*сістэмна-структурнымі*) фактарамі:

Знешнія фактары	Унутраныя фактары
неабходнасць стандартызацыі дакументаў; агульнасць дыдактычных задач школы; дыялектныя і іншамоўныя ўплывы і інш.	наяўнасць моўна-маўленчых варыянтаў; працэсы фанетычнага і лексічна-граматычнага развіцця; адзінства правапіснай сістэмы і інш.

Значная роля ў захаванні і пашырэнні нормаў літаратурнай мовы належыць мастацкай літаратуры, тэатру, сістэме адукацыі, сродкам масавай інфармацыі.

1.6. Беларуская нацыянальная мова і формы яе існавання

I. Беларуская нацыянальная мова – мова вусных і пісьмовых зносін беларускай нацыі, адна з найбольш істотных яе прымет.

Як катэгорыя пэўнай гістарычнай эпохі, нацыянальная мова фарміруецца ў перыяд пераўтварэння народнасці ў нацыю, якая характарызуецца агульнасцю тэрыторыі, мовы, эканамічнага жыцця і псіхічнага складу насельніцтва. Мова выступае як адзін з найважнейшых кансалідуючых фактараў, што яднае, ператварае народнасць у нацыю.

Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Вышэйшая школа, 2017. – 588 с. : іл.
С91 ISBN 978-985-06-2024-8.

Вучэбны дапаможнік створаны з улікам сучасных тэндэнцый у беларускай лінгвістыцы. У ім поўна і рознабакова падаецца сістэматызаваны тэарэтычны курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Усе ўключаныя ў дапаможнік тэмы максімальна структураваныя, што дазваляе выкарыстоўваць кнігу і як даведачнае выданне. Важнае месца адводзіцца аналізу моўных адзінак.

Для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па філалагічных спецыяльнасцях. Будзе карысны магістрантам, аспірантам, настаўнікам і выкладчыкам.

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.2Беи-923

Вучэбнае выданне

Дзятко Дзмітрый Васільевіч
Лобань Наталля Пятроўна
Мароз Святлана Сяргееўна і інш.

СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА

Вучэбны дапаможнік

Рэдактар *Л.М. Макейчык*
Мастацкі рэдактар *В.А. Ярашэвіч*
Тэхнічны рэдактар *Н.А. Лебядзевіч*
Карэктары *Т.К. Хваль*, *А.І. Галдзянкова*
Камп'ютарная вёрстка *В.А. Самсонавай*, *А.М. Бабянковай*

Падпісана ў друк 23.08.2017. Фармат 60×90/16. Папера афсетная. Гарнітура «Times New Roman».
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 37,0. Ул.-выд. арк. 38,85. Тыраж 500 экз. Заказ 2365.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Вышэйшая школа"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/3 ад 08.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
e-mail: market@vshph.com http://vshph.com

Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня "Перамога"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна.